**Н. Ю. Паўлоўская**

# АБ СУАДНОСІНАХ АЦЭНКІ І МАДАЛЬНАСЦІ

Ацэнка і мадальнасць – універсальныя з’явы. Лінгвісты вывучаюць гэтыя паняцці ў якасці канцэптаў, працэсаў, маўленчых актаў, катэгорый, моўных адзінак.

Ацэнка выражае адносіны моўцы да аб’екта рэчаіснасці – асобы, прадмета, з’явы – і трактуецца ў шырокім і вузкім сэнсе. Шырокае разуменне ацэнкі – гэта яе інтэрпрэтацыя ў якасці «адной з асноўных функцый мовы побач з намінацыяй, камунікацыяй, падачай усіх відаў залежнасцей, сувязей і суадносін» (Н. Ю. Шведава). Гэта свет суб’ектыўнага, які асацыіруецца з маўленнем увогуле і ўключае ў сябе велізарны спектр эмацыянальных, рацыянальных, часавых, прасторавых, сэнсарных, этычных, эстэтычных

і іншых адносін, рэалізуючыся ў выказваннях з адпаведнымі прапазіцыямі: *цудоўныя абшары, прыйшоў своечасова, спыніўся каля леса, быў у добрым настроі, сумленне мучыць, дзяўчына прыгожая* і г.д.

Ацэнка ў вузкім сэнсе звязваецца з прыметай 'дрэнна/добра' і ў якасці аксіялагічнай адзінкі змяшчае звесткі пра пункт погляду суб'екта, згодна з чым яна ажыццяўляецца: *прыемныя навіны/брыдкія ўспаміны.*

Прысутнасць ацэначнай моўнай адзінкі сведчыць аб рэалізацыі пэўным суб'ектам інтэлектуальнай ці эмацыянальнай апрацоўкі таго, што стаіць за выказваннем. Пры гэтым высвятляецца здольнасць чалавека аддзяляць у працэсе маўленчай дзейнасці суб'ектыўны момант ад уласна інфармацыйнага, інакш кажучы, нейтральна-фактычнага, што заканамерна карэліруе з дыхатаміяй «модус – дыктум», прапанаванай Ш. Балі. Гэта значыць, што ацэначнасць ляжыць у аснове модусных катэгорый, у тым ліку і мадальнасці, як замацаваны ў вопыце чалавека спосаб адносін да зместу выказвання. Розным тыпам модусаў адпавядаюць розныя варыянты ацэначнасці. Ацэнка ў шырокім сэнсе супараўнальная паняццю *модусу.*

На думку Н. Д. Аруцюнавай, ацэнку можна ідэнтыфікаваць як суб'ектыўную пераменную (экстэнсіянал) да аб'ектыўнай семантычнай канстанты – прапазіцыі (інтэнсіяналу).

Мадальнасць – адна з цэнтральных ацэначных катэгорый мыслення і мовы, якая суадносіць выказванне і рэчаіснасць з пункту погляду моўцы ў адпаведнасці з паўнатой яго ведаў пра аб'ект, ступенню задаволенасці патрэб, жаданняў, імкненняў, інтарэсаў, мэтаў. Згодна з палажэннямі сучаснай інтэгратыўнай кагнітыўна-дыскурсіўнай парадыгмы, навуковых ведаў, палявай арганізацыі мадальнасць правамерна структураваць у якасці макрапалёў валевыяўлення з палямі імператыўнасці, аптатыўнасці, неабходнасці, і імавернасці з палямі праблематычнай, простай, катэгарычнай верагоднасці, магчымасці з іх наступным іерархічным падзелам (Н. Ю. Паўлоўская).

Мовазнаўчыя і іншыя гуманітарныя навукі не маюць агульнапрынятага погляду на суадносіны ацэнкі і мадальнасці, паколькі існуюць шматлікія трактоўкі і сістэматызацыі гэтых з'яў у залежнасці ад розных падыходаў, асноў і прынцыпаў іх аналізу, якія ўмоўна можна аб'яднаць у наступныя групы: 1) ацэнка і мадальнасць – самастойныя з'явы (А. М. Пяшкоўскі, Ц. П. Ломцеў, Л. С. Ярмалаева, В. М. Бандарэнка; 2) мадальнасць – універсальная агульнамоўная катэгорыя, якая можа ўключаць розныя віды ацэнкі (В. У. Вінаградаў, А. У. Бандарка, Т. В. Раманава); 3) ацэнка і мадальнасць не размяжоўваюцца, а іх дэфініцыі замяняюць адна адну (Ш. Балі, А. М. Вольф, А. Вяжбіцкая Н. Д. Аруцюнава, А. А. Кібрык).

З нашага пункту погляду, мадальнасць, як вынік інтэлектуальнай, рацыянальнай апрацоўкі выказвання, уваходзіць у паняційную прастору ацэнкі (шырокае разуменне), выступае адным з яе складнікаў. Аднак суб'ектыўна-ацэначныя параметры кожнага віда мадальнасці выступаюць яе асноўнымі класіфікатарамі. У той жа час ацэначныя адзінкі экспліцытна ці імпліцытна кваліфікуюць выказванне і яго кампаненты паводле параметраў 'добра/дрэнна', уступаючы ў адносіны з мадальнымі паказчыкамі па розных прынцыпах лагічных сувязей узаемадапаўнення, узаемапранікнення, узаемазамяшчэння, сумежнасці і інш.

Агульнымі для ацэначных і мадальных адзінак высупаюць наступныя характарыстыкі:

– ацэнка і мадальнасць антрапацэнтрычныя, яны – сігналы суб'ектыўных адносін, што прысутнічаюць у любым выказванні;

– ацэнка і мадальнасць абумоўлены не першасным (анталагічным) падзелам свету, а другаснымі (суб'ектыўнымі) адносінамі да яго;

– ацэнка і мадальнасць – суб'ектыўныя пераменныя велічыні ў адносінах да прапазіцыі выказвання. Прапазіцыя з'яўляецца прыналежнасцю дэскрыптыўнай семантыкі, якая фіксуе асаблівасці аб'ектыўнага свету, выражае адносіны выказвання да аб'ектыўнай рэчаіснасці. Ацэначныя і мадальныя значэнні характарызуюць «адносіны паміж светам рэчаіснасці і яго ідэалізаванай (канцэптуальнай) мадэллю, якія наладжваюцца пэўным суб'ектам» (Н. Д. Арруцюнава);

– инварыянтам ацэначных і мадальных адзінак выступае пэўная якасць, залежная ў першую чаргу ад моўцы і ад класа аб'ектаў, адносна якіх наладжваецца ацэнка (розныя аб'екты могуць не мець нічога агульнага паміж сабою, але іх ацэначная кваліфікацыя цалкам можа быць тоеснай);

– ацэначныя і мадальныя значэнні сінкрэтычныя, могуць змяшчаць некалькі розных сэнсаў;

– ацэначныя і мадальныя формы паводле жадання моўцы могуць быць насычаны большай ці меншай колькасцю дэскрыптыўнай інфармацыі;

– ацэначныя і мадальныя сродкі заўсёды выступаюць кампанентамі адпаведных сітуацый, якія фарміруюцца з дапамогай наступных актантаў: суб'екта, які ацэньвае; ацэначных/мадальных адзінак; аб'екта ацэнкі/мадальнасці;

– ацэнка і мадальнасць ахопліваюць усе моўныя ўзроўні.

Адрозненні паміж ацэнкай і мадальнасцю ляжаць у нятоеснасці іх кагнітыўнай і семантычнай структуры, функцыянальна-прагматычным, камунікатыўным патэнцыяле, моўных сродках выражэння.

Так, выказванне з артыкула З. Ціхановіча «Загадка аўтографаў Міхася Чарота» (Звязда, 3.04.2021) *Хто ведае, ці не з'яўляецца Змітро Кудзелька кроўным галоўнага героя нашага артыкула – Міхася Кудзелькі, найбольш вядомага пад псеўданімам «Міхась Чарот»? Можа, дапамогуць чытачы «Звязды»?* характарызуецца агульнай станоўчай ацэначна-мадальнай танальнасцю праблематычнай верагоднасці, увасобленай у моўныя формы няўпэўненасці і меркавання з дапамогай сінтаксічных канструкцый *хто ведае, ці не з'яўляецца ...*, пабочнага слова *можа,* пытальных сказаў, дэйктычнага актуалізатара *хто.* З дапамогай фармальных сродкаў мадальнасці праблематычнай верагоднасці аўтар, ацэньваючы стан спраў, хоча змяніць сітуацыю – знайсці сваякоў знакамітага пісьменніка і заклікае чытачоў дапамагчы яму. У выніку камунікатыўных ацэначных установак аўтара паверхневы мадальны сэнс праблематычнай верагоднасці эксплікуе глыбінную семантыку мадальнасці волевыяўлення 'дапамажыце'.

У святле вышэйсказанага ацэнка і мадальнасць – узаемазалежныя велічыні, не існуюць асобна і складаюць сутнасць любога віда камунікацыі.